# *§ 64–0. Навука і культура сучаснай Беларусі

**ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА**
**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**
**СУСВЕТНАЯ СПАДЧЫНА ЮНЕСКА**
**«БЕЛАРУСЬФІЛЬМ»**

**1. Прыярытэтныя кірункі развіцця навукі. Інавацыйнае і навукова-тэхналагічнае развіццё.** Навука — важны фактар умацавання дзяржаўнага суверэнітэту, яна інтэлектуальна забяспечвае дасягненне ключавой мэты — пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі. Наша рэспубліка ўваходзіць у лік дзяржаў з высокім узроўнем навукова-тэхнічнага развіцця. За гады суверэнітэту навуковы патэнцыял краіны значна вырас. У Беларусі паспяхова развіваецца акадэмічная, універсітэцкая, галіновая навука.

Арганізацыя навуковых даследаванняў

Арганізацыю, каардынацыю навуковых даследаванняў, інавацыйнага развіцця забяспечваюць *Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь.* Нацыянальная акадэмія навук Беларусі з'яўляецца базавай арганізацыяй Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук, актыўна развівае міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва з найбуйнейшымі навуковымі цэнтрамі свету. Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях ажыццяўляе рэгуляванне і кіраванне ў сферах навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, ахову правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці.

Успомніце, калі была створана Акадэмія навук БССР. Якімі дасягненнямі праславіліся беларускія вучоныя?

Кадравы патэнцыял беларускай навукі — гэта звыш 17 тыс. даследчыкаў. Вышэйшую навуковую кваліфікацыю па стане на 1 студзеня 2024 г. маюць 3,2 тыс. вучоных, у тым ліку 519 дактароў і 2687 кандыдатаў навук. У навуковыя даследаванні і распрацоўкі актыўна ўцягваецца моладзь. Пятая частка кадравага складу акадэмічнай і ўніверсітэцкай навукі — маладыя вучоныя.

Беларускія вучоныя праводзяць даследаванні і распрацоўкі ў шырокім спектры кірункаў.

Да найбольш значных дасягненняў сучасных беларускіх вучоных адносяць дасягненні ў касмічнай галіне.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Прыярытэтныя кірункі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2021–2025 гг., зацверджаныя Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2020 г.:

1) лічбавыя інфармацыйна-камунікацыйныя і міждысцыплінарныя тэхналогіі, заснаваныя на іх вытворчасці;
2) біялагічныя, медыцынскія, фармацэўтычныя і хімічныя тэхналогіі і вытворчасці;
3) энергетыка, будаўніцтва, экалогія і рацыянальнае прыродакарыстанне;
4) машынабудаванне, машынабудаўнічыя тэхналогіі, прыборабудаванне і інавацыйныя матэрыялы;
5) аграпрамысловыя і харчовыя тэхналогіі;
6) забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства, дзяржавы.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады дасягненняў беларускай навукі ў названых кірунках.*
2. *Растлумачце, які ўнёсак гэтыя навуковыя даследаванні робяць у павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, паскарэнне эканамічнага росту і забеспячэнне нацыянальнай бяспекі краіны.*

### Дасягненні ў касмічнай галіне

На калязямной арбіце працуюць Беларускі касмічны апарат дыстанцыйнага зандавання Зямлі, спадарожнік сувязі «Белінтэрсат-1», нанаспадарожнік БДУ. На іх базе створаныя Беларуская касмічная сістэма дыстанцыйнага зандавання Зямлі, На-

цыянальная сістэма спадарожнікавай сувязі і вяшчання. Ад 2012 г. Беларусь уваходзіць у лік касмічных дзяржаў, у 2013 г. стала паўнапраўным членам Камітэта ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах. Палёт у 2024 г. у космас першага касманаўта суверэннай Беларусі М. В. Васілеўскай умацаваў статус Беларусі як касмічнай дзяржавы.

**Даследаванні біятэхналогій**

У Рэспубліцы Беларусь праводзяцца даследаванні ў галіне біятэхналогій. Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя (БНБК) — адзін з самых маштабных тэхналагічных праектаў, запушчаны з ініцыятывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у лістападзе 2022 г. БНБК рэалізуе праект па глыбокай перапрацоўцы зерня, ядром якога з'яўляюцца інавацыйныя прадукты — амінакіслоты, а таксама збалансаваныя камбікармы і кармавыя дабаўкі, што адпавядаюць найвышэйшым міжнародным стандартам. У свеце такія тэхналогіі маюць толькі сем краін.

**Даследаванні ў галіне медыцыны, фармацыі**

У Беларусі распрацаваныя метады клетачнай імунатэрапіі анкалагічных захворванняў. Іх выкарыстанне значна павялічвае выжывальнасць пацыентаў і прадухіляе вяртанне хваробы. Створаныя новыя метады дыягностыкі хвароб чалавека і жывёл паводле інфармацыі, зашыфраванай у ДНК.

**Развіццё атамнай энергетыкі**

Пасля запуску ўласнай атамнай электрастанцыі Беларусь цалкам адмовілася ад імпарту электрычнай энергіі, скараціла імпарт прыроднага газу. Увод у эксплуатацыю БелАЭС выступіў моцным стымулам для развіцця энергаёмістых вытворчасцей, інфраструктуры для электратранспарту, цэнтраў апрацоўкі даных, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і г. д.

**Развіццё IT-тэхналогій**

У Беларусі рэалізуецца курс на пабудову IT-краіны і пераход да лічбавай эканомікі. Рэспубліка ўваходзіць у лік сусветных лідараў у экспарце IT-паслуг на душу насельніцтва. Айчынныя IT-навінкі

ўкараняюць у сферы аховы здароўя, адукацыі, транспарту і лагістыкі, прамысловасці, аховы навакольнага асяроддзя, біятэхналогій, будаўніцтва. Рэсурсы сеткі 5G, што распрацоўваюць беларускія вучоныя, адкрыюць перспектывы для развіцця інавацыйных кірункаў: беспілотны транспарт, канцэпцыя «Разумнага горада».

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю «Топ-10 дасягненняў беларускіх вучоных у XXI ст.».

Дасягненні сучаснай беларускай навукі прадстаўлены ў Міжнародным выставачным цэнтры ў Мінску.

Задачы дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры

**2. Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне культуры. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.** Мэты, задачы і асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры вызначаны ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры. Гэты дакумент увайшоў у сілу ў 2017 г. і з'яўляецца першым на постсавецкай прасторы.

**Асноўныя задачы дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры:**
- захаванне гістарычнай памяці беларускага народа, яго нацыянальна-культурнай самабытнасці і традыцый;
- актыўнае ўцягванне грамадзян у культурнае жыццё краіны, рэалізацыя творчага патэнцыялу нацыі.

У сферы культуры функцыянуе каля *5 тыс. дзяржаўных арганізацый*: клубы, публічныя бібліятэкі, музеі, тэатры, канцэртныя арганізацыі, цыркі, паркі культуры і адпачынку.

Рэспубліка Беларусь захавала і паспяхова развівае *сістэму адукацыі ў сферы культуры*, якая ўключае дзіцячыя школы мастацтваў, установы сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Падтрымка дзяржавы

Культура атрымлівае *падтрымку з боку дзяржавы*. Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва штогод фінансуе 5–10 найбольш значных творчых праектаў. Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі вядзе работу па стварэнні спрыяльных умоў для выяўлення і развіцця творчых здольнасцей дзяцей і моладзі, арганізуе міжнародныя і рэспубліканскія конкурсы. Ад 1997 г. штогод праходзіць уручэнне прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Цырымонія ўручэння прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». 2025 г.*

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся імёны лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» ў бягучым годзе. За якія дасягненні ім прысуджана прэмія?*
2. *Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Унёсак лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь „За духоўнае адраджэнне“ ў развіццё Беларусі».*

**Фестывальны рух**

Найважнейшым кірункам дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры выступае *фестывальны рух*. Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» аб'ядноўвае мільёны людзей і дзясяткі краін на розных кантынентах. Сярод іншых найбуйнейшых фестывальных брэндаў Беларусі — свята «Александрыя збірае сяброў», Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі, Міжнародны тэатральны фестываль «Белая Вежа», Міжнародны фестываль мастацтваў «Беларуская музычная восень» і інш.

Даведайцеся, калі і дзе праходзяць гэтыя фестывалі.

**Кінематаграфія**

У Рэспубліцы Беларусь развіваецца *кінематаграфія*. Пачынаючы з 1993 г. пры падтрымцы дзяржавы праходзіць Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад». Асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». У 2021 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ «Аб развіцці кінематаграфіі», які прадугледжвае фінансаванне вытворчасці фільмаў і правядзення кінематаграфічных мерапрыемстваў.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ










*У 2023–2025 гг. «Беларусьфільм» прадставіў гледачам шэраг прэм'ер, якія маюць важнае значэнне для фарміравання гістарычнай памяці беларускага народа, павагі да яго гістарычнай мінуўшчыны, сістэмы каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Якім гістарычным падзеям прысвечаныя фільмы на ілюстрацыях? Якія каштоўнасці яны транслююць гледачам?*

### Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны

Беларусь мае багатую духоўную і культурную спадчыну, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца часткай дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, што жывуць у Рэспубліцы Беларусь (арт. 15); кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці (арт. 54). Частка найбольш выбітных для айчыннай і сусветнай культуры аб'ектаў уключаная ў спісы Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Якія аб'екты матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ўключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА?

Захаваць гісторыка-культурную спадчыну нашай краіны шмат у чым удаецца дзякуючы Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь штогод папаўняецца і ўключае больш за 5 тыс. гісторыка-культурных каштоўнасцей. Сярод іх палацава-паркавы ансамбль у г. Гомель, Барысаглебская (Каложская) царква

Даведайцеся, якія гісторыка-культурныя каштоўнасці ёсць у вашым рэгіёне.

ў г. Гродна, Аўгустоўскі канал у Гродзенскім раёне, царква абароннага тыпу ў в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна, комплекс былога кляштара езуітаў у г. Нясвіж, Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква ў г. Полацк, комплекс фартыфікацыйных збудаванняў Брэсцкай крэпасці, Камянецкая вежа ў г. Камянец і інш.



*Брэсцкая крэпасць. Пяты форт*

Даведайцеся гісторыю гэтага гістарычнага збудавання.

Захаванне і папулярызацыя культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа, яго самабытнасці, далучэнне насельніцтва да нацыянальных каштоўнасцей з'яўляюцца важнымі задачамі паводле Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 ад 9 красавіка 2025 г. «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы».

**3. Спартыўныя дасягненні.** Рэспубліка Беларусь упэўнена заявіла пра сябе на сусветнай спартыўнай арэне і па праве ганарыцца званнем спартыўнай краіны. Падрыхтоўка будучых прафесійных спартсменаў у Беларусі ажыццяўляецца ў розных навучальных установах: ад дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, спецыялізаваных школ і вучылішчаў алімпійскага рэзерву да Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. У краіне створаныя ўмовы для заняткаў спортам і фізкультурай, прадстаўленыя ў больш чым 23 тыс. фізкультурна-спартыўных аб'ектаў.



*Басейн, адкрыты ў 2024 г. у Мінску, цалкам адпавядае стандартам Міжнароднай федэрацыі плавання*

За гады суверэнітэту ў Беларусі з'явілася шмат новых спартыўных збудаванняў. Сярод найбольш значных — комплексы «Чыжоўка-Арэна», «Мінск-Арэна», Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы, цэнтр фрыстайла і інш.

Правядзенне чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 г. у Беларусі пацвердзіла высокі ўзровень развіцця гэтага віду спорту ў краіне і наяўнасць сучаснай базы для яго развіцця. У 2019 г. у Беларусі адбыліся II Еўрапейскія гульні. Беларускія спартсмены на іх здабылі 69 медалёў (24 залатыя, 16 срэбраных і 29 бронзавых).

**Дасягненні беларускіх спартсменаў**

У чэрвені 2024 г. беларускія спартсмены ўпершыню выступілі на міжнародных спаборніцтвах «Спартыўныя гульні краін БРІКС». Па выніках турніру Рэспубліка Беларусь заняла другое месца ў агульна-

камандным заліку, здабыўшы 247 медалёў (55 залатых, 85 срэбраных і 107 бронзавых).

Пачынаючы з 1994 г. беларускія спартсмены прадстаўляюць нашу краіну на Алімпійскіх гульнях асобнай камандай. За гэты час Беларусь дасягнула значных поспехаў у спорце, што дазволіла ёй заняць годнае месца сярод вядучых спартыўных краін свету.



*Ю. Несцярэнка*

Асабліва памятныя для беларусаў першае алімпійскае золата, якое здабыла для суверэннай краіны Кацярына Карстэн (веславанне), золата Аляксея Грышына — першага ў гісторыі беларускага спорту чэмпіёна зімовых Алімпійскіх гульняў (фрыстайл), сенсацыйная перамога на 100-метроўцы бягунні з Брэста Юліі Несцярэнка, перамога Сяргея Мартынава, які ўстанавіў на Алімпіядзе новы сусветны рэкорд па стральбе з вінтоўкі. У 2024 г. Іван Літвіновіч зрабіўся першым двухразовым алімпійскім чэмпіёнам у гісторыі мужчынскіх скачкоў на батуце. Яўген Залаты ўпершыню за ўсю суверэнную гісторыю Беларусі здабыў алімпійскі медаль у мужчынскім акадэмічным веславанні.



*Д. Домрачава*

У 2014 г. Зімовыя Алімпійскія гульні ў Сочы сталі самымі паспяховымі ў гісторыі беларускага спорту. Нашы спартсмены здабылі 5 залатых медалёў. Трохразовай алімпійскай чэмпіёнцы Дар'і Домрачавай нададзена званне Героя Беларусі.

Усё больш людзей з абмежаванымі магчымасцямі далучаюцца да спорту. У Беларусі функцыянуюць спартыўныя ўстановы фізкультурна-аздараўленчага прызначэння для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама створаныя ўмовы для заняткаў спортам у спартыўных установах агульнага карыстання.



*І. Бокій*

Гонар і павагу выклікаюць высокія вынікі беларускіх паралімпійцаў. На XV летніх Паралімпійскіх гульнях-2016 у Рыа-дэ-Жанейра беларуская зборная здабыла 10 медалёў: 8 залатых (Ігар Бокій — 6, Андрэй Праневіч — 1, Уладзімір Ізотаў — 1), 2 бронзавыя (Аляксандр Трыпуць, Ігар Бокій).

*Культурнае развіццё суверэннай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца працягам духоўнага развіцця беларускага народа. Захоўваючы гісторыка-культурную спадчыну мінулых стагоддзяў, наш народ развівае сучасную сістэму адукацыі, дасягае вышынь у навуковых даследаваннях і рэалізацыі творчага патэнцыялу кожнага грамадзяніна краіны.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| 1992 г. — пачатак правядзення фестывалю папулярнай музыкі «Белыя ночы» ў Санкт-Пецярбургу (Расійская Федэрацыя) | 1992 г. — пачатак правядзення музычнага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Прывядзіце не менш чым 5 доказаў высокага ўзроўню навукова-тэхнічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.
2. Назавіце галоўныя задачы дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Прывядзіце прыклады іх рэалізацыі.
3. Складзіце калаж «Гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь», уключыўшы ў яго славутасці ўсіх абласцей краіны.
4. Раскажыце пра дасягненні беларускіх спартсменаў у адным з відаў спорту (на ваш выбар).3